Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
УА «Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М.Машэрава»

**Гістарычны факультэт**

**Кафедра гісторыі Беларусі**

**Вучэбна-метадычныя матэрыялы па курсу**

# Гістарычнае краязнаўства

Вучэбная праграма для спецыяльнасці:
1-23 01 12 **Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны** (по накірунках)
Направление специальности:
1-23 01 12-04 **Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны** (культурная спадчына і турызм) (8 семестр)

Укладальнік: **Півавар** Мікалай Васільевіч, дацэнт

Віцебск
2012

Репозиторий ВГУ

## Змест

**I. Арганізацыйна-метадычны раздзел**
**II. Размеркаванне гадзін кура па формах і відах працы**
**III. Змест вучэбнага курса**
**IV. Рэкамендаваная літаратура**
**V. Планы семінарскіх заняткаў**
**VI. Пытанні да экзамена**
**VII. Тэсты для самастойнай працы**

Репозиторий ВГУ

## I. Арганізацыйна-метадычны раздзел

**1.1. Мэты выкладання дысцыпліны:** падрыхтоўка будучых настаўнікаў да самастойнай работы, фарміраванне ўменняў і навыкаў навукова-даследчай працы на аснове краязнаўчага матэрыялу, выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу ў сваёй працы, што спрыяе павышэнню якасці адукацыі, пазнанню сваёй Радзімы, патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў.

**1.2. Задачы вывучэння дысцыпліны**

1. Сфарміраваць уяўленне ў студэнтаў у значнасці краязнаўства ў пазнанні сваёй малой Радзімы цалкам.
2. Навучыць студэнтаў валодаць асноўнымі навуковымі метадамі пошуку краязнаўчай інфармацыі.
3. Студэнты павінны авалодаць методыкай арганізацыі краязнаўчай работы ў школе.
4. Навучыць ажыццяўляць зберажэнне і выкарыстанне гісторыка-культурнай спадчыны.
5. Сфарміраваць веды найбольш адметных помнікаў архітэктуры, гісторыі, садова-паркавае мастацтва Беларусі і інш.

## II. Размеркаванне гадзін кура па формах і відах працы

**2.1. Найменне тэм, іх змест, аб'ём у гадзінах лекцыйных заняткаў**

| № п/п | Тэма | Змест | Аб'ём у гадзінах |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| | **Уводзіны ў краязнаўства Беларусі** | Паняцце “краязнаўства”. Сутнасць і значэнне літаратурнага і гістарычнага краязнаўства. Формы арганізацыі краязнаўства: навуковае, грамадскае, школьнае. Крыніцы краязнаўчай інфармацыі. Роля краязнаўства ў патрыятычным выхаванні, справе аховы помнікаў гісторыі і культуры, экалогіі. | 2 |
| | **Станаўленне гістарычнага краязнаўства Беларусі** | Старажытныя крыніцы па краязнаўству Беларусі (летапісы, хронікі і інш.). Адраджэнне. Цікавасць да вывучэння гісторыі края ў XVI – XVII стст. Працы Я. Ласіцкага, С. Рысінскага, М. Стрыйковского. Запісы ў дзённіках замежных падарожнікаў (Ж. де Ланаа, С. Герберштэйна, Б. Танера, А. Гваньіні і інш.). Прыватныя бібліятэкі і музейныя зборы XVIII ст. Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў, Агінскіх. Краязнаўчая дзейнасць пасля ўключэння Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Полацкі езуіцкі калегіум (акадэмія) | 4 |
| | **Гістарычнага краязнаўства Беларусі ў пачатку XIX – пачатку XX ст.** | “Дэмакратызацыя” краязнаўчай дзейнасці ў пачатку XIX ст. Пачатак навуковага вывучэння края (З. Даленга-Хадакоўскі, Т. Нарбут, браты Тышкевічы, А. Кіркор і інш.). Развіццё гістарычнага краязнаўства на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст. Навуковыя таварыствы, камісіі, камітэты, аматарскія гурткі, музеі. Віленскі музей старажытнасцей. | 6 |

Репозиторий ВГУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Стварэнне і дзейнасць Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея. Віцебская вучоная архіўная камісія, Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. Выданне зборнікаў дакументаў і матэрыялаў («Витебская старина», «Минская старина» і інш.). Краязнаўчыя матэрыялы ў перыядычным друку. Беларускія краязнаўцы канца XIX – пачатку XX стст.: А.Я. Багдановіч, М.В. Доўнар-Запольскі, Р.С. Зянькевіч, Д.І. Даўгяла М.Я. Нікіфароўскі, У.Г. Краснянскі, М.Ф. Кусцінскі, Е.Р. Раманаў, А.П. Сапуноў, А.М. Семянтоўскі, А.К. Сержпутоўскі, У.К. Стукаліч, В.П. Федаровіч, П.М. Шпілеўскі, П. Шэйн і інш. | |
| | **“Залатое” дзесяцігодзе савецкага краязнаўства** краязнаўства ў 1930-я гг. Краязнаўства ў Зах. Беларусі. | Росквіт савецкага краязнаўства ў 1920-я гг. Інбелкульт як каардынуючы цэнтр краязнаўчых арганізацый Беларусі. ЦБК. ВАКТ. Дзейнасць М.І. Каспяровіча. Часопіс “Наш край”. Рэгіянальныя выданні: “Віцебшчына”, “Полаччына”. Краязнаўства ў Заходняй Беларусі. Змены ў змесце і сутнасці краязнаўчай дзейнасці ў 1930-я гады. | 2 |
| | **Краязнаўства ў 1940-я – сярэдзіне 1980-х гг.** | Школьнае краязнаўства: Рэспубліканскія экспедыцыі піянераў і школьнікаў. Пошукавы рух. Гурткі, клубы, арганізацыя паходаў, рэспубліканскіх экспедыцый піянераў і школьнікаў, школьных гісторыка-краязнаўчых музеяў і куткоў, пошукавы рух. Грамадскае краязнаўства: дзейнасць БДТАПГіК, праца краязнаўцаў-аматараў. Навуковае краязнаўства: праца вну, краязнаўчых музеяў, архіваў, краязнаўчых аддзелаў бібліятэк. | 2 |
| | **Сучасны стан і перспектывы краязнаўства** | Асноўныя накірункі развіцця школьнага краязнаўства. Грамадскае краязнаўства: дзейнасць БДТАПГіК, БФК, ГА “Талака”, “Паходня”, “Узгор’е”, “Повязь”, “Маладзік”, БКТ, праца аматараў. Шматтомная серыя гісторыка-хранікальных кніг “Памяць”. Мясцовыя краязнаўчыя выданні, “Краязнаўчая газета”. Краязнаўчыя рэсурсы ў Інтэрнэце. Рэгіянальныя асаблівасці ў развіцці краязнаўства Беларусі. Праблема дылетантызма ў краязнаўстве і шляхі яе вырашэння. Перспектывы і праблемы развіцця краязнаўства | 2 |
| | **Роля архіваў у краязнаўчай працы** | Архіўныя матэрыялы ў краязнаўстве (архіўныя установы РБ, арганізацыя іх дзейнасці работы з архіўнымі матэрыяламі). | 2 |
| | **Роля музеяў і бібліятэк у краязнаўчай працы** | Матэрыялы па гісторыі краю у музеях (паняцце "музей", яго тыпы, музей як крыніца і сродак вывучэння краю). Музеі Беларусі, Музеі Віцебшчыны, Віцебска, рэгіёна пражывання. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк Бібліятэчная сетка РБ, краязнаўчая дзейнасць бібліятэк розных відаў і тыпаў, абласныя бібліятэкі – цэнтры краязнаўчай інфармацыі ў рэгіёне | 2 |
| | **Краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе** | Музейная педагогіка і краязнаўства. Асноўныя формы краязнаўчай работы ў школе: краязнаўчыя вечарыны, віктарыны, алімпіяды, канферэнцыі; гурткі і клубы; турысцка-краязнаўчыя экскурсіі, паходы нядзельнага адпачынку, экспедыцыі; мемарыялізацыя падзей; школьны краязнаўчы музей. Арганізацыя і правядзенне краязнаўчай экскурсіі і паходу нядзельнага адпачынку. Арганізацыя і дзейнасць турысцка-краязнаўчага гуртка. Праграма гуртка. | 2 |
| | **Помнікі гісторыі і культуры** | Класіфікацыя помнікаў гісторыі і культуры, заканадаўства па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцяў стылі. Асноўныя тыпы археалагічных | 2 |

Рэпазіторый ВДУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | помнікаў і іх спецыфіка. Пісьмовыя крыніцы па гісторыі Беларусі. Іх класіфікацыя і характарыстыка. Помнікі і памятныя месцы гераічнага мінулага. Мясціны звязаныя з гісторыяй гаспадарчай дзейнасці на Беларусі. Памятныя месцы звязаныя з жыццём і дзейнасцю знакамітых людзей Беларусі. Помнікі народнай, культавай, абарончай і грамадзянскай архітэктуры. Гісторыка-ландшафтныя помнікі на Беларусі: маёнткі, сядзібы, паркі. Помнікі вайсковай славы. Памятныя мясціны на Віцебшчыне. Помнікі і мемарыяльныя дошкі Віцебшчыны. | |
| | **Помнікі гісторыі і культуры Беларусі** | Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі. Асноўныя гісторыка-культурныя каштоўнасці Брэсцкай Гродзенскай, Гомельскай, Мінскай, Магілёўскай вобласці і г. Мінска. Смаленск, Пскоў, Даўгаўпілс, Беласток | 4 |
| | **Помнікі гісторыі і культуры Беларусі** | Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі. Асноўныя гісторыка-культурныя каштоўнасці Брэсцкай Гродзенскай, Гомельскай, Мінскай, Магілёўскай вобласці і г. Мінска. Смаленск, Пскоў, Даўгаўпілс, Беласток | 4 |
| | **Гісторыка-культурныя каштоўнасці Віцебшчыны** | Гісторыка-культурныя каштоўнасці Віцебшчыны, іх асноўныя віды і этнакультурная характарыстыка. Улік і ахова помнікаў на сучасным этапе. | 2 |
| | **Помнікі гісторыі і культуры Віцебска** | Гісторыка-культурная спадчына Віцебска | 2 |
| | **Выкарыстанне спецыяльных гістарычных дысцыплін ў вывучэнні края** | Анамастыка (антрапаніміка і тапаніміка) як крыніца па гісторыі краю. Геральдыка і сфрагістыка ў краязнаўчых даследаваннях. Геральдыка Віцебшчыны. Генеалогія. Складанне радавода. Роля палеаграфіі ў краязнаўчых даследаваннях. Эпіграфіка. Нумізматыка. | 4 |
| | **Краязнаўства і турызм** | Турыстычныя рэсурсы Беларусі, Віцебшчыны, наваколляў Віцебска. Характарыстыка Паазер'я (Паўночнай Беларусі): клімат, геалогія, прыроды, насельніцтва, канфесійны склад, шляхі зносін. Гісторыя Падзвіння. Гістарычныя экскурсы найбуйнешых гарадоў: Віцебск, Полацк, Орша, раённых цэнтраў. Заходняя Віцебшчына (Віленшчына). Сучасны стан вобласці. Формы, метады, віды, краязнаўчай дзейнасці: асветніцка-адукацыйная, навуковая, грамадская, выдавецкая. Віды працы: конкурсы, турысцка-краязнаўчыя паходы і экскурсіі, грамадскія акцыі, пленэры, канферэнцыі, экспедыцыі, канцэрты, гульні "Горад наш", "Палёт над горадам". Дыягностыка вынікаў. | 4 |

Репозиторий ВГУ

# III. Змест вучэбнага курса
## УВОДЗІНЫ

Паняцце “краязнаўства”. Сутнасць і значэнне гістарычнага краязнаўства. Краязнаўства як міжгаліновая дысцыпліна, форма грамадскай дзейнасці, метад,. Узаемасувязь і спецыфіка паняццяў “край”, “рэгіён”, “краязнаўства” і “беларусазнаўства”, “рэгіяналізм”, “рэгіёназнаўства”, “краязнаўчы дакумент” (тэкст). Комплекснае і галіновае краязнаўства. Формы арганізацыі гістарычнага краязнаўства: навуковае, грамадскае, школьнае. Разуменне краязнаўства ў свеце: Францыі, Германіі, Польшчы, Чэхіі, Украіне, Расіі. Праблемы і перспектывы краязнаўства. Дылетанства, глабалізацыя. Роля краязнаўства ў патрыятычным выхаванні, фарміраванні гістарычнай свядомасці, нацыянальнай самасвядомасці, справе аховы помнікаў гісторыі і культуры. Сувязь гістарычнага краязнаўства з літаратурнай і музейнай справай. Краязнаўства і турызм. Месца краязнаўства ў дзяржаўнай ідэалогіі.

Крыніцы краязнаўчай інфармацыі. Літаратура і крыніцы для гісторыка-краязнаўчых даследаванняў. Праблема класіфікацыі крыніц. Пісьмовыя крыніцы інфармацыі: летапісы, хронікі, запісы падарожнікаў, мемуары, дыярыўшы, юрыдычныя дакументы, комплексы дакументаў эканамічнай накіраванасці (інвентары, вопісы), эпісталярная літаратура, перыёдыка, мясцовыя выданні і інш. (каталогі, прэйскуранты, лістоўкі, афішы, плакаты, праграмы чытанняў, спектакляў, запрашальныя білеты, візітныя білеты, аб’явы). Даведачныя выданні.

Графічныя дакументы. Вусныя крыніцы. Рэчавыя помнікі.

## Раздзел 1.
## ГІСТОРЫЯ РАЗВІЦЦЯ ГІСТАРЫЧНАГА КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ

Узнікненне цікавасці да гісторыі краю ў XVI–XVII стст. Значенне летапісаў і хронік для развіцця гістарычнага краязнаўства на беларускіх землях. Адлюстраванне мясцовай гісторыі ў беларуска-літоўскіх летапісах. Мясцовыя летапісы: “Баркулабаўскі летапіс”, “Хроніка Сурты”, “Віцебскі летапіс”. Уплыў Адраджэння на працы Я. Ласіцкага, С. Рысінскага, М. Стрыйкоўскага. Запісы замежных падарожнікаў (Ж. де Ланаа, С. Герберштэйна, Р. Гейдэнштэйна, Б. Танера і інш.), дыярыўшы і дзённікі як крыніцы краязнаўчай інфармацыі. Прыватныя бібліятэкі і музейныя зборы XVIII ст. Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў, Агінскіх, Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Даследаванні Бжаздоўскага. Зборы пры манастырах і навучальных установах.

Далучэнне беларускіх земляў да Расійскай імперыі. Гісторыка-статыстычныя (тапаграфічныя) даследаванні Беларусі канца XVIII–першай паловы XIX ст. Экспедыцыі І.І. Ляпёхіна, В.М. Севяргіна. Краязнаўчая дзейнасць студэнтаў Віленскага універсітэта. Румянцаўскі гурток і праца яго сяброў на Беларусі. Вывучэнне краю мясцовымі даследчыкамі (З. Даленга-Хадакоўскі, Т. Нарбут, браты Тышкевічы, А. Кіркор і інш.).

Развіццё гістарычнага краязнаўства на Беларусі ў другой палове XIX ст. Навуковыя таварыствы, камісіі, камітэты, аматарскія гурткі, музеі. Віленскі музей старажытнасцей. Віленская археаграфічная і Віленская археалагічная камісіі. Роля дзейнасці рэгіянальнага аддзялення РГТ на беларускіх землях. Краязнаўчая дзейнасць губернскіх статыстычных камітэтаў на беларускіх землях і іх публікатарская дзейнасць (“Памятныя кніжкі”, “Адрас-календары”). “Губернскія ведамасці” і “Епархіальныя ведамасці” як крыніца краязнаўчай інфармацыі.

Цэнтральны архіў старажытных актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерній – цэнтр архіўных даследаванняў Віцебшчыны. Стварэнне і дзейнасць грамадскіх таварыстваў (Паўночна-Заходняе аддзялення РГТ, Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі, Таварыства віцебскіх сельскіх гаспадароў) па вывучэнні Віцебчшыны. Роля епархіяльных упраўленняў у арганізацыі краязнаўчых даследаванняў Беларусі ў XIX – пач. XX ст. Стварэнне і дзейнасць Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея. IX Археалагічны з'езд у Вільні 1–2.08. 1893 г. і яго роля ў ажыўленні краязнаўчых даследаванняў беларускіх зямель.

Рэпазіторый ВДУ

Стварэнне краязнаўчых таварыстваў у розных гарадах Беларусі ў пачатку XX ст. (Магілёўскага царкоўна-археалагічнага музея, Гродзенскага гістарычнага царкоўна-археалагічнага камітэта, Мінскага царкоўна-археалагічнага музея, Мінскага таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі і інш.). Роля Віцебскай вучонай архіўнай камісіі ў вывучэнні Віцебшчыны (Віцебскае аддзяленне МАІ, выдавецкая і грамадская дзейнасць). Выданне зборнікаў дакументаў і матэрыялаў (“Витебская старина”, “Минская старина” і інш.). Краязнаўчыя матэрыялы ў перыядычным друку. Важнейшыя краязнаўчыя выданні другой паловы XIX ст: “Живописная Россия” (том 3 1882), “Россия. Полное географическое описание” (Том 5. “Верхнее Поднепровье и Белоруссия”), “Опыт описания Могилевской губернии”, пад рэдакцыяй А. Дэмбавецкага (1882–1884), “Слоўнік геаграфічны Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін”, іншыя даследаванні

Беларускія краязнаўцы другой паловы XIX – пачатку XX ст.: А.Я. Багдановіч, М.В. Доўнар-Запольскі, Р.С. Зянькевіч, Дз.І. Даўгяла М.Я. Нікіфароўскі, У.Г. Краснянскі, М.Ф. Кусцінскі, В. Мяніцкі, Е.Р. Раманаў, А.П. Сапуноў, А.М. Семянтоўскі, А.К. Сержпутоўскі, У.К. Стукаліч, В.П. Федаровіч, П.М. Шпілеўскі, П. Шэйн і інш. Развіццё краязнаўства ў рэгіёнах Беларусі і Віцебшчыне (на Полаччыне, Лепельшчыне, Сенненшчыне і інш.).

“Залатое дзесяцігоддзе” савецкага краязнаўства (1921 – 1929), сутнасць і змест фенамену. Краязнаўчыя аб’яднанні пры навуковых і вучэбных установах ў 1920-я гг. Інбелкульт як каардынуючы цэнтр краязнаўчых арганізацый Беларусі. Цэнтральнае бюро краязнаўства. Часопіс “Наш край”. Развіццё архіўнай і музейнай справы ў БССР. Археалагічныя даследаванні А. Н. Ляўданскага, К. М. Палікарповіча, С. А. Дубінскага, І. А. Сербава.

Змены ў змесце і сутнасці краязнаўчай дзейнасці ў 1930-я гады. Рэпрэсіраванне вядучых краязнаўцаў, кваліфікацыя іх дзейнасці як “нацдэмаўшчыны”. Лёс часопіса “Наш край” (“Савецкая краіна”), закрыццё Цэнтральнага бюро краязнаўства, роспуск акруговых краязнаўчых таварыстваў. Захаванне музейнага і школьнага накірункаў у краязнаўстве.

Краязнаўства ў Заходняй Беларусі. Роля краязнаўства ў гісторыі і ідэалагічнай барацьбе ў Другой Рэчы Паспалітай. Рэгіяналізм. Польскія і беларускія краязнаўчыя арганізацыі. Краязнаўства як сродак ідэалагічнай барацьбы супраць беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Краязнаўчая дзейнасць І.І. Стаброўскага, Ю. Ядкоўскага, М. Пецюкевіча, О. Гедэмана, Я. Драздовіча, Я. Булгака. Краязнаўчы аспект у дзейнасці Беларускага музея ў Вільне, Беларускай гімназіі, Гродзенскага археалагічнага музея, Дзісненскай гімназіі.

Гістарычнае краязнаўства пасля Другой сусветнай вайны. Асноўныя віды існавання краязнаўства: навуковае, грамадскае, школьнае.

Музейны, турысцка-краязнаўчы і пошукавы накірункі школьнага краязнаўства. Формы школьнага краязнаўства ў 1940-я – сярэдзіне 1980-х гг.: гурткі, клубы, арганізацыя паходаў, рэспубліканскіх экспедыцый піянераў і школьнікаў, школьных гісторыка-краязнаўчых музеяў і куткоў. Экспедыцыя “Мая Радзіма – СССР”. Роля Рэспубліканскага і краязнаўства і абласных цэнтраў пазашкольнай працы ў развіцці краязнаўчага руху ў БССР. Краязнаўства і ваенна-патрыятычнае выхаванне.

Грамадскае краязнаўства. Роля Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры ў ахове гісторыка-культурнай спадчыны краіны, краязнаўчых даследаваннях рэгіёнаў, прапаганды і папулярызацыі падзеяў мінуўшчыны. Роля бюлетэня “Помнікі гісторыі і культуры Беларусі” ў пашырэнні краязнаўчых даследаванняў. Дзейнасць краязнаўцаў-аматараў у 1940-я – першай палове 1980-х гг.

Развіццё краязнаўства з сярэдзіны 1980-х да нашых дзён. Змены ў стаўленні да краязнаўства з другой паловы 1980-х гг. Арганізацыйныя змены ў грамадскім краязнаўстве. Змены ў тэматыцы краязнаўства. Уклад Улашчыка М., Каханоўскага Г., Ткачова ў развіццё гістарычнага краязнаўства Беларусі. Кніга М. Улашчыка “Была такая вёска” і У. Арлова “Таямніцы полацкай гісторыі” – класічны прыклад краязнаўчай працы.

Репозиторий ВГУ

Утварэнне Беларускага фонду культуры, нефармальных грамадскіх аб'яднанняў "Талака" (Мінск), "Майстэрня" (Мінск), стварэнне Беларускага краязнаўчага таварыства, змены ў змесце дзейнасці БДТАПГіК. Дзейнасць гісторыка-культурнага таварыстваў "Узгор'е" (г. Віцебск).

Краязнаўцы-аматары Віцебшчыны: І. Абрамава, В. Арлоў, М. Баўтовіч, І. Бунта, М. Гіль, У. Глушкоў, І. Зямчонак, К. Кожан, А. Куржалаў, В. Лютынскі, А. Падліпскі, М. Плавінскі, Л. Хмяльніцкая, К. Шыдлоўскі, А. Шынкевіч, І. Януш і іншыя.

Гісторыяграфічныя даследаванні лакальнай гісторыі. Краязнаўчая тэматыка ў сродках масавай інфармацыі. Мясцовыя краязнаўчыя выданні: "Браслаўскія чытанні", "Браслаўскія сшыткі", "Віцебскія сшыткі", "Полацкі летапісец", "Павет", "Нашы карані", "Сумежжа", "Краязнаўцы Паазер'я" і другія. "Краязнаўчая газета". Краязнаўчая інфармацыя ў энцыклапедычных выданнях. Краязнаўчыя рэсурсы ў Інтэрнеце.

Сучасны стан краязнаўства. Структура сучаснага гістарычнага краязнаўства: традыцыйныя накірункі (сацыяльна-эканамічны, соцыякультурны, гісторыка-літаратурны) і спецыяльны (царкоўнае краязнаўства, мастацказнаўчае, гісторыка-экалагічнае, горадазнаўства, некрапалезнаўства і інш. патэнцыяльныя магчымаці гістарычнага краязнаўства ў выяўленні, захаванні і выкарыстанні культурнай і прыроднай спадчыны.

Рэгіянальныя асаблівасці ў развіцці краязнаўства Беларусі. Праблема дылетантызма ў краязнаўстве і шляхі яе вырашэння. Перспектывы і праблемы развіцця краязнаўства на сучасным этапе.

## Раздзел 2.
## РОЛЯ АРХІВАЎ, МУЗЕЯЎ І БІБЛІЯТЭК У ВЫВУЧЭННІ КРАЯЗНАЎСТВА

Архіўныя ўстановы ў Рэспубліцы Беларусь і арганізацыя іх дзейнасці. Дзяржаўныя архівы Віцебскага рэгіёну, характарыстыка іх фондаў. Методыка працы з архіўнымі матэрыяламі.

Паняцце "музей", яго тыпы, музейныя крыніцы вывучэння краю. Музейная сетка Рэспублікі Беларусь. Гістарычныя і краязнаўчыя музеі. Краязнаўчы музей –цэнтр па арганізацыі і правядзенні вывучэння рэгіёну. Матэрыялы па гісторыі краю у мясцовых музеях. Віцебскі абласны краязнаўчы музей і яго філіялы: склад фондаў і экспазіцыі. Школьны краязнаўчы музей.

Сучасныя сузеі як цэнтры вывучэння рэгіянальнай гісторыію. Агульная характарыстыка музеяў Віцебскай вобласці. Характарыстыка лепшых музеяў краю. Музеі Полацка. Музеі Оршы. Браслаўскае раённае аб'яднанне. Музеі Віцебска. Музей садавода І. Сікоры ў в. Малыя Алашкі. КАЦ імя Я. Драздовіча ў в. Германавічы. Музей СШ № 3 г. Мёры. Школныя музеі ў вв. Іванск Чашніцкага раёна, Ветрына Полацкага раёна, Празарокі Глыбоцкага раёна і інш.

Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк. Бібліятэчная сетка РБ, краязнаўчая дзейнасць бібліятэк розных відаў і тыпаў, абласныя навук. Бібліяграфічныя рэсурсы краязнаўчай інфармацыі. Электронныя базы інфармацыі.

## Раздзел 3.
## ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ

Паняцце "помнік гісторыі і культуры", "гісторыка-культурная каштоўнасць". Заканадаўства Рэспублікі Беларусь па ахове помнікаў.

**Класіфікацыя** помнікаў. Праблемы класіфікацыі. Матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці: звычаі, традыцыі, абрады, фальклор (вусная народная творчасць), мова, яе дыялекты, змест геральдычных, тапанімічных аб'ектаў і твораў народнага мастацтва. Катэгорыі гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Рэпазіторый ВГУ

Архітэктурна-мастацкія стылі: старажытнарускі (у т.л. полацкая і гродзенская школы дойлідства), готыка, барока, класіцызм, ампір, псеўдарускі, неаготыка, эклектыка, мадэрн і г.д.

Характарыстыка асноўных тыпаў **археалагічных** помнікаў Беларусі. Значэнне археалагічных помнікаў у вывучэнні краю. Помнікі архітэктуры. Помнікі і памятныя месцы гістарычнага мінулага. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі і Віцебшчыны. Пісьмовыя крыніцы па гісторыі краю. Этнаграфічныя крыніцы ў вывучэнні быту і культуры насельніцтва краю. Этнаграфічныя калекцыі, збор мясцовага фальклору.

**Помнікі гісторыі і культуры Беларусі.**

**Помнікі абарончага дойлідства Беларусі.** Быхаўскі замак, Гайцюнішскі дом-крэпасць, Гальшанскі замак, Гродзенскі замак, Камянецкая (Белая) вежа, Крэўскі замак, Лідскі замак, Мірскі замак, Наваградскі замак, Смалянскі замак.

**Помнікі культавага дойлідства Беларусі.** Святадухаўскі кафедральны сабор у Мінску, храмы абарончага тыпу: касцёл у в. Ішкальдзь, касцёл Яна Хрысціцеля ў в. Камаі Пастаўскага раёна, Свята-Міхайлаўская царква ў в. Сынкавічы, Свята-Раства-Багародзіцкая царква ў в. Мураванка; касцёл Узнясення Прасвятой Дзевы Марыі ў Пінску, Спаса-Прэабражэнская царква ў г. Заслаўе, Сафійскі сабор у Полацку, Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку, Святадухаўская царква ў Куцеінскім манастыры (Орша); храм у Сар'і, Дабравешчанская царква, Пакроўскі сабор, Рынкавая царква, Успенскі сабор у Віцебску, Спаса-Прэабражэнская царква ў Чачэрску, Свята-Пакроўская царква ў в. Карма; касцёл Св.Францішка Ксаверыя ў Гродна, Барыса-Глебская (Каложская) царква ў Гродна, Фарны касцёл Божага цела ў Нясвіжы, Жыровіцкі манастыр, Мікалаеўская царква ў Магілёве, касцёл Прасвятой Дзевы Марыі ў Мсціслаўлі, Петра-паўлаўскі сабор і капліца кн. Паскевічаў у Гомелі .

**Палацы і сядзібы Беларусі.** Палац у в. Косава Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці, палац Бутрымовічаў у г.Пінску Брэсцкай вобласці, палац у в. Ружаны Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці, палац ваеннага губернатара ў г. Віцебску, палац Тызенгаўзаў у г.Паставы Віцебскай вобласці, палац Румянцавых-Паскевічаў у г. Гомелі, палац у г. Нясвіж Мінскай вобласці. Сядзібава-паркавыя комплексы свайго раёна (горада), якія захаваліся (поўнасцю ці часткова) да нашага часу. Дакладная назва аб'екта, месцазнаходжанне, архітэктурна-мастацкі стыль, канфесійную прыналежнасць, асобныя часткі і элементы архітэктурнага аблічча.

**Помнікі манументальнай скульптуры Беларусі.** Максіму Багдановічу ў Мінску, Францішку Багушэвічу ў в.Жупраны Ашмянскага раёна, Сымону Буднаму ў Нясвіжы, Уладзіміру Караткевічу ў Оршы і ў Віцебску, Якубу Коласу ў Мінску, Янку Купалу ў Мінску і ў в.Ляўкі Аршанскага раёна, Адаму Міцкевічу ў Навагрудку, Пятру Мсціслаўцу ў Мсціслаўлі, Напалеону Ордзе ў Іванаве Брэсцкай вобласці, Ефрасінні Полацкай у Мінску і ў Полацку, Сімяону Полацкаму ў Полацку, Францыску Скарыну (Мінск, Полацк, Ліда), Кірылу Тураўскаму ў Тураве.

**Помнікі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі, Віцебшчыны.** Курган Славы Савецкай арміі — вызваліцельніцы Беларусі ў Смалявіцкім раёне, мемарыяльны комплекс “Хатынь”, помнік экіпажу М.Гастэла ў Маладзечанскім раёне, манумент Перамогі ў Мінску, помнік піянеру-партызану Марату Казею ў Мінску, мемарыяльны комплекс “Брэсцкая крэпасць-герой”, манумент у гонар Маці-патрыёткі ў Жодзіна, мемарыяльны комплекс “Буйніцкае поле” ў Магілёўскім раёне, помнік Ц.П.Бумажкову ў г.п.Акцябарскі Гомельскай вобласці, мемарыяльны ансамбль у гонар воінаў-памежнікаў у Гродна, мемарыяльны комплекс “Прарыў” ва Ушацкім раёне, мемарыяльны комплекс “Праклён фашызму” ў Докшыцкім раёне, мемарыяльны комплекс у Віцебску ў гонар савецкіх воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў Віцебшчыны. Найбольш значныя помнікі ў межах свайго раёна.

**Гісторыка-культурныя каштоўнасці Віцебшчыны**, іх асноўныя віды і этнакультурная характарыстыка. Помнікі культавага дойлідства. Помнікі архітэктуры. Помнікі гісторыі. Помнікі горадабудаўніцтва. Помнікі мастацтва.

Рэпазіторый ВДУ

**Помнікі гісторыі і культуры Віцебска**.

Віцебскія замкі (Верхні, Ніжні, Узгорскі). Гарадскія ўстановы: гарадскі магістрат, ратуша, Пошта, тэлеграф, тэлефон. Гатэлі Віцебска ў пачатку ХХ ст. Банкі (пазямельны, дваранскі). Аптэкі. Бальніцы. Тэатр. Кінатэатр. Саслоўныя ўстановы (дваранскі сход).

Культавыя ўстановы. Цэрквы і манастыры (Мікалаеўскі, Успенскі, Уваскрасенскі). Касцёлы (Антонія). Сінагогі. Кірхі.

Гандлёвыя ўстановы (крамы, рынкі). Навучальныя ўстановы. Агульнаадукацыйныя (мужчынская Александраўская гімназія, прыватная гімназія Неруша, жаночая гімназія, вучылішчы). Спецыяльныя (мужчынскае духоўнае вучылішча, жаночае духоўнае вучылішча, настаўніцкі інстытут, аддзяленне МАІ). Бібліятэкі. Помнікі. Вуліцы. Дамы (дом генерала Аша, Кібардзіна, Назімава, генерал-губернатара). Трамвай. Прыстань. Чыгуначны вакзал. Гарадскія сады. Батанічны сад. Могілкі.

**Праблемы ўліку і аховы помнікаў гісторыі і культуры на сучасным этапе**. Правядзенне мерапрыемстваў па выяўленню, арганізацыі экспертызы, падрыхтоўкі да надання статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці аб'ектам.

## Раздзел 4.
## КРАЯЗНАЎСТВА Ў ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ

Роля краязнаўства ў фарміраванні гістарычнай свядомасці і нацыянальнай самасвядомасці. Месца краязнаўства ў сістэме дзяржаўнай ідэалогіі. Роля Рэспубліканскага цэнтра турызма і краязнаўства, абласных цэнтраў пазашкольнай працы з дзецьмі і падлеткамі ў арганізацыі краязнаўчай працы ў навучальных і выхаваўчых установах.

Формы выкарыстання краязнаўства на занятках. Факультатыўныя заняткі па краязнаўству. Асноўныя формы пазакласнай краязнаўчай работы ў школе: краязнаўчыя вечарыны, віктарыны, алімпіяды, канферэнцыі; гурткі і клубы; турысцка-краязнаўчыя экскурсіі, паходы нядзельнага адпачынку, экспедыцыі, удзел у пошукавым руху; мемарыялізацыя падзей; школьны краязнаўчы музей.

Музейная педагогіка. Арганізацыя і правядзенне краязнаўчай экскурсіі і паходу нядзельнага адпачынку. Арганізацыя і дзейнасць турысцка-краязнаўчага гуртка. Праграма гуртка. Краязнаўчыя дапаможнікі.

Роля краязнаўчых даледаванняў у развіцці экскурсійна-турыстычнай дзейнасці. Узроставыя асаблівасці ў методыцы падрыхтоўцы і правядзенні экскурсіі, краязнаўчых мерапрыемстваў.

## Раздзел 6.
## ВЫКАРЫСТАННЕ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН У ВЫВУЧЭННІ КРАЯ

**Анамастыка** (антрапаніміка і тапаніміка) як крыніца па гісторыі края.

Імя ў гісторыі і культуры Свету. Сэнс і значэнне імені. Імёны розных народаў. Славянскія імёны. Матывы выбару імені. Як даць імя. Мода на імёны. Мянушкі, нікі. Тлумачэнне паходжання прозвішчаў: патранімічны, прафесійны, характарыстычны. Асноўныя крыніцы па этымалогіі прозвішчаў і імёнаў.

Тапаніміка і тапанімія. Іх сувязь. Асноўныя віды тапонімаў: агаронімы, айконімы, аронімы, гадонімы, гідронімы, драмонімы, макратапонімы, мікратапонімы, урбанонімы. Асноўныя прынцыпы тлумачэння тапонімаў.

Гідронімы. Іх віды, асноўныя фарманты. Правілы вызначэння этымалогіі назвы тапоніма. Тыпалогія паходжання гідронімаў балцкага і фіна-угорскага паходжання. Складанасці пры тлумачэнні фіна-ўгорскіх і балцкіх гідронімаў. Тыпалогія гідронімаў славянскага паходжання.

Характарыстыка тапонімаў, назвы якіх атрыманы па асаблівасцях прыроднага асяроддзя. Тапонімы, назвы якіх ўтварыліся ад імёнаў і прозвішчаў асоб. Тапонімы назвы якіх звязаныя з гаспадарчым жыццём, заняткамі насельніцтва ці азначаюць сацыяльна-

Рэпазіторый ВДУ

гаспадарчую прыналежнасць. Тапонімы, назвы як звязаны з анімістычнымі ўяўленнямі, грамадскай структурай і ідэалогіяй, этнічным паходжаннем. Новастворанвя назвы. Асноўныя этапы перайменаванняў тапонімаў на Беларусі. Тапанімія Віцебска. Тапанімія Віцебшчыны. Тлумачэнне назваў населеных месцаў Беларусі, асноўных тапонімаў Беларусі, Віцебшчыны. Выкарыстанне вынікаў тапанімічных даследаванняў у вывучэнні краю.

**Геральдыка**. Асноўныя правілы і нормы геральдыкі. Тлумачэнне сімволікі, сэнсу асноўных колераў, геральдычных фігур, знакаў, шчытоў. Гісторыя развіцця геральдыкі на Беларусі. Геральдычныя сімвалы Віцебшчыны. Гістарычныя гербы Віцебшчыны. Новастворананыя гербы краю. Асаблівасці геральдыкі Віцебшчыны. Геральдыка Аналіз геральдычных сімвалаў Ф. Скарыны.

**Нумізматыка**. Нумізматыка як сродак вывучэння грашовага звароту, гандлю, развіцця эканомікі краю. Скарбы – крыніца ведаў па гісторыі рэгіёну. Найбольш вядомыя знаходкі скарбаў на Беларусі, Віцебшчыне. Характарыстыка асноўных этапаў развіцця грашовай сістэмы Беларусі. Асаблівасці грашовых адносін у гісторыі краю.

**Генеалогія**. Асноўныя крыніцы па генеалогіі. Асноўныя прынцыпы складання радавода. Крыніцы інфармацыі па вывучэнні гісторыі родаў. Славутыя роды Беларусі і Віцебшчыны, іх генеалагічныя дрэвы: Агінскія, Валадковічы, Лапацінскія, Сапегі, Храптовічы, Цэханавецкія. Асаблівасці сацыяльнай структуры на Віцебшчыне. Панцырныя баяры.

**Фальклор і этнаграфія**. Сувязь фальклорных і этнаграфічных звестак з краязнаўствам. Тлумачэнне легенд і паданняў у вывучэнні краю.

.

## Раздзел 7.
## КРАЯЗНАЎСТВА І ТУРЫЗМ

Характарыстыка Паазер’я (Паўночнай Беларусі): клімат, геалогія, прыроды, насельніцтва, канфесійны склад, шляхі зносін. Гісторыя Падзвіння. Гістарычныя экскурсы найбуйнешых гарадоў: Віцебск, Полацк, Орша, раённых цэнтраў. Заходняя Віцебшчына (Віленшчына). Сучасны стан вобласці.

Турыстычныя рэсурсы Беларусі, Віцебшчыны. Памятныя мясціны. Славутыя асобы Віцебшчыны (па раёнах і гарадах). Складанне турысцка-краязнаўчага маршрута.

Арганізацыя краязнаўчай працы ў рэгіёне. Праца Віцебскага акруговага краязнаўчага таварыства, М. Каспяровіча.

Формы, метады, віды, краязнаўчай дзейнасці: асветніцка-адукацыйная, навуковая, грамадская, выдавецкая. Віды працы: конкурсы, турысцка-краязнаўчыя паходы і экскурсіі, грамадскія акцыі, пленэры, канферэнцыі, экспедыцыі, канцэрты, гульні “Горад наш”, “Палёт над горадам”. Дыягностыка вынікаў.

Прэзентацыя краязнаўчай працы ў мясцовым друку. Стварэнне краязнаўчага нумару мясцовага перыядычнага выдання, падрыхтоўка бюлетэня. Тэматыка рэгіянальных даследаванняў: юбілеі, памятныя даты, тэматычныя артыкулы і нумары, славутыя асобы. Прапагандысцкая літаратура: календары, лістоўкі, буклеты, паштоўкі. Асобныя выданні.

Репозиторий ВГУ

## IV. Планы семінарскіх заняткаў
## "Гістарычнае краязнаўства"
**(І курс, 2 семестр)**

### Тэма 1. УВОДЗІНЫ Ў КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ.

1. Паняцце "краязнаўства". Сутнасць і значэнне гістарычнага краязнаўства.
2. Формы арганізацыі гістарычнага краязнаўства.
3. Крыніцы краязнаўчай інфармацыі.
4. Сувязь гістарычнага краязнаўства з музейнай справай. Роля краязнаўства ў патрыятычным выхаванні.

***Літаратура***

1. Ашурков, В.Н. Историческое краеведение: учебное пособие для исторических факультетов педагогических институтов / В.Н. Ашурков, Б.В. Кацюба, Г.Н. Матюшин; под ред. Г. Н. Матюшина. – М.: Просвещение, 1980. – 192 с.
2. Историческое краеведение Белоруссии: учебное пособие для исторических факультетов вузов республики; под ред. Э.М. Загорульского. – Мн: Изд. БГУ им. В.И. Ленина, 1980. – 263 с.
3. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI—XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.
4. Краязнаўства // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 4. – Мн., 1998. – С. 452.
5. Півавар М. Месца краязнаўства ў гістарычнай навуцы і дзяржаўнай ідэалогіі Беларусі, Расіі, Украіны ў другой палове XX ст. // Краязнаўчая газета. – 2004. – № 25.
6. Півавар, М.В. Пошукавы рух як сфера краязнаўчай дзейнасці / М.В. Півавар // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2005. – № 1. – С. 36–39.
7. Півавар, М.В. Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове XX стагоддзя / М.В. Півавар // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. № 3. – С. 46–52.
8. Цітовіч І.У. Краязнаўства як фактар умацавання патрыятычных пачуццяў беларускай моладзі // Проблемы управления. – 2005. – № 1. – С. 128 – 132.

### Тэма 2. Гісторыя краязнаўства Віцебшчыны

Семінар 1

***Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – кан. XIX ст.***

1. Станаўленне гістарычнага краязнаўства: мясцовыя хронікі, працы па гісторыі краю М. Стрыйкоўскага, А. Гваніні, Я. Ласіцкага, С. Рысінскага, І. Кульчынскага.
2. Развіццё гістарычнага краязнаўства ў першай палове XIX ст. Румянцаўскі гурток і праца яго сяброў на Беларусі.
3. Краязнаўчая дзейнасць губернскіх статыстычных камітэтаў на беларускіх землях.і іх "Памятные книжки".
4. Краязнаўчая дзейнасць Т. Нарбута, З. Даленга-Хадакоўскага, Я. І К. Тышкевічаў, М. Без-Карніловіча.
5. Краязнаўчая дзейнасць А. Кіркора, А.К. Сержпутоўскага, П.М. Шпілеўскага, Р.С. Зянькевіча, А.М. Семянтоўскага, Е.Р. Раманава, П.В. Шэйна.

**Рэфераты:**

1. Адлюстраванне мясцовай гісторыі ў беларуска-літоўскіх летапісах, "Баркулабаўскім летапісе", "Хроніцы Сурты", "Віцебскім летапісе".
2. "Віцебскі летапіс" як крыніцы вывучэння краю.
3. "Чарцёж г. Віцебска 1664 г." як крыніцы вывучэння краю.

Репозиторий ВГУ

4. Значэнне летапісаў XVII–XVIII ст. для развіцця гістарычнага краязнаўства на беларускіх землях
5. М.П. Румяцаў і дзейнасць румянцаўскага гуртка на беларускіх землях
6. Краязнаўчая дзейнасць студэнтаў Віленскага універсітэта.
7. Віцебшчына ў працы М.В. Без-Карніловіча "Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии...".
8. Беларускае вольнае эканамічнае таварыства і яго роля ў даследаванні краю.
9. Цэнтральны архіў старажытных актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерній – цэнтр архіўных даследаванняў Віцебшчыны
10. Роля Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта ў арганізацыі даследаванняў і іх публікацыі іх вынікаў на тэрыторыі Віцебскай губерні.
11. "Памятные книжки Витебской губернии" як гістарычная крыніца.
12. Гісторыя Віцебшыны ў краязнаўчых публікацыях Губернскіх статыстычных камітэтаў ("Памятныя кніжкі", "Адрас-календары") і "Губернскіх ведамасцяў".

### *Літаратура*


1. Улащик Н.Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н.Н. Улащик. – Мн.: Наука, 1973. – 303 с.
2. Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси XVI веке – 30-е годы XX века. / Л. В. Алексеев. – Минск: Беларуская навука, 1996. – 206 с.
3. Историческое краеведение Белоруссии: учебное пособие для исторических факультетов вузов республики; под ред. Э.М. Загорульского. – Мн: Изд. БГУ им. В.И. Ленина, 1980. – 263 с.
4. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI—XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.
5. Каханоўскі Г.А., Каханоўскі А.Г. Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч. – Мн., 1991.
6. Півавар, М.В. Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.: даведнік / М.В. Півавар. – Віцебск: Віцебск. абл. друк., 2006. – 176 с.
7. Прадзеіна, А. Абуджаць гістарычную рамантыку / А. Прадзеіна // Беларуская мінуўшчына. 1998. – № 1. – С. 30–32.
8. Трэпет, Л. Краязнаўства / Л. Трэпет // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі.: у 6 т. – Мінск, 1998. – Т. 4. – С. 257–260.
9. Витебский губернский статистический комитет // Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917) / Т.Е. Леонтьев [и др.]. – Мн.: БелНИИДАД, 2009. – С. 382–385; Памятные кніжкі губерняў // ЭГБ. – Т. 5. – Мн., 1999. – С. 397
10. Дайнеко А.А. «Памятные книжки Витебской губернии» как источник изучения промышленности Витебщины 1861 – 1900 гг. // Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова, Віцебск, 6–7 чэрвеня 2001 г. – Мн.: БелНДІДАС, 2002. – С. 146–149.


Семінар 2

### *Гістарычнае краязнаўства Беларусі кан. XIX – 1-й паловы XX ст*

1. Даследаванні Віцебшчыны А.П. Сапуновым, М.Я. Нікіфароўскім, У.К. Стукалічам, Д.І. Даўгялам, М.Ф. Кусцінскім, В.П.Федаровічам, У.Г. Краснянскім .
2. Віцебская вучоная архіўная камісія, Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута.
3. "Залатое дзесяцігоддзе" савецкага краязнаўства (1919–1929 гг.). Змены ў змесце і характары краязнаўчай працы ў 1930-я гады.
4. Краязнаўчыя даследаванні у Заходняй Беларусі (Ота Гедэман – выдатны даследчык Браслаўшчыны, Генерал Стаброўскі і развіццё краязнаўства на Слонімшчыне, Ян

Репозиторий ВГУ

Булгак, праца музея ў г. Гродна. Краязнаўчая дзейнасць Язэпа Драздовіча, Мар'яна Пецюкевіча)

**Рэфераты:**

1. IX Археалагічны з'езд у Вільні 1–2.08. 1893 г. і яго роля ў ажыўленні краязнаўчых даследаванняў беларускіх зямель
2. Гісторыка-статыстычны камітэт для апісання цэркваў і прыходаў епархіі пры Свята-Уладзіміраўскім брацтве
3. Мясцовая гісторыя на старонках "Губернскіх ведамасцяў" у XIX – пач. XX ст.
4. "Витебские губернские ведомости" і развіццё гістарычнага краязнаўства на Віцебшчыне
5. "Витебская старина" А.П. Сапунова.
6. "Странички из недавней старины города Витебска" М.Я. Нікіфароўскага.
7. Паўночна-Заходняе аддзяленне Рускага геаграфічнага таварыства
8. Віцебшчына на старонках навукова-папулярных выданняў мяжы XIX-XX стст.
    1. А) Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье: Репринтное воспроизведение издания 1882 г. (под редакцией Семенова П.П. – Т.3, СПб., М., 1882. – 490 с.). – Мн.: БелЭн, 1994. – 550 с.
    2. Б) Характарыстыка выдання "Россия. Полное географическое описание нашего Отечества / Под ред. В.П.Семенова. Т. 9. Верхнее Поднепровье и Белоруссия" (СПб., 1905).
    3. В) "Витебская губерния. Историко-географический и статистический отчет. Вып. 1. История. Природа. Население. Просвещение. Составлен по программе и редакцией кн. В.М. Долгоруково. Витебск: губ. Типография, 1890"
    4. Г) Віцебшчына на старонках энцыклапедыі: "Slownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów slowjañskich"
9. Полацкі археалагічны гурток (пачатак XX ст.)
10. Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута
11. Гісторыка-краязнаўчыя выданні пачатку XX ст. ("Полоцко-Витебская старина", "Трудов ВУАК", працы В.С. Арсенцьева
12. Адлюстраванне побыту і светапогляду сялян Віцебшчыны ў працах М.Я. Нікіфароўскага.
13. Калекцыя В.П. Федаровіча

<u>**Творчае заданне:**</u>

Правесці параўнальны аналіз развіцця гістарычнага краязнаўства ў БССР і Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд (пісьмова).

**Рэфераты** па тэме "Краязнаўства Беларусі ў 1919 – 1939 гг."

1. Выдавецка-бібліяграфічная дзейнасць Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства.
2. Неперыядычны зборнік "Віцебшчына".
3. Краязнаўчая дзейнасць Я. Драздовіча.
4. Часлаў Пяткевіч і яго даследаванне "Рэчыцкае Палессе"
5. Ота Гедэман – выдатны даследчык Браслаўшчыны
6. Генерал Стаброўскі і развіццё краязнаўства на Слонімшчыне
7. Ян Булгак – фатограф і краязнаўца
8. Краязнаўчы рух Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд 1919–1939 гг.

***Літаратура***

1. Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси XVI веке – 30-е годы XX века. / Л. В. Алексеев. – Минск: Беларуская навука, 1996. – 206 с.

Репозиторий ВГУ

2. Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: Матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова. 6-7 чэрвеня 2001 г. – Віцебск. – Мн.: БелНДІДАС, 2002. – 232 с.
3. Булгак Ян. Край дзіцячых гадоў. – Мн.: Беларусь, 2004. – 415 с.
4. Гужалоўскі А.А. Беларускія музеі (1918—1941 гг.). – Мн., 2002.
5. 90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. Матэрыялы навуковай канферэнцыі 24 лістапада 1999 г., Віцебск. – Мн.: БелНДІДАС, 2000. – 92 с.
6. Историческое краеведение Белоруссии: учебное пособие для исторических факультетов вузов республики; под ред. Э.М. Загорульского. – Мн: Изд. БГУ им. В.И. Ленина, 1980. – 263 с.
7. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI—XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.
8. Бондарчик В.К., Чигринов И.Г. Николай Яковлевич Никифоровский (1845–1910): Очерк жизни и деятельности. – Мн., 1960.
9. Півавар, М.В. Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.: даведнік / М.В. Півавар. – Віцебск: Віцебск. абл. друк., 2006. – 176 с.
10. Хмяльніцкая Л. Гісторык з Віцебска (жыццяпіс Аляксея Сапунова). – Мн.: Энцыклапедыкс, 2001. – 256 с.
11. Падліпскі А. Летапісец Віцебчышыны. Мн.: “Полымя”, 1993. – 92 с.
12. Лісаў А., Падліпскі А. Краязнавец Мікалай Каспяровіч. – Віцебск: УПП “Віцебская абласная друкарня”, 2000. – 46 с.
13. Цітовіч І.У. Краязнаўчы рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / І.У. Цітовіч; Беларус. дзярж. ун-т. – Мн., 2005. – 16 с.
14. Чыгрын С. Генерал... ад краязнаўства [Стаброўскі І.І.] // Беларуская мінуўшчына. – 1995. –№ 3. – С. 54–58
15. Шумейко М.Ф. Витебская ученая архивная комиссия – центр архивно-археографических и краеведческих изысканий в губернии в первой четверти XX в. // Источниковедение и краеведение в культуре России... – С. 318–320.
16. Шумейко М.Ф. Полевая, камеральная и эдиционная археография в деятельности Витебской ученой архивной комиссии // 90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі... – С. 25–31.
17. Шумейко М.Ф. Архивист и археограф Дмитрий Иванович Довгялло. – Мн.: БелНИИДАД, 2002. – 165 с.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, артыкулы: Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута, Віцебская вучоная архіўная камісія, Віцебскае акруговае краязнаўчае таварыства; Витебские губернские ведомости, Віцебская даўніна, Віцебскі абласны краязнаўчы музейВіцебскі летапіс, Віцебскі царкоўна-археалагічны музей, Віцебскі цэнтральны архіў старажытных актаў, “Віцебшчына”, Краязнаўства, “Наш край” і інш. Глядзець па персаналіях: Сапуноў А.П., Нікіфароўскі М.Я. Прыклад: Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута // ЭГБ. – Т. 2. – Мн.: БелЭн, 1994. – С. 318.

Семінар 3

### *Гістарычнае краязнаўства Беларусі другой паловы XX ст да нашых дзён*

1. **Асноўныя накірункі развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі другой паловы XX ст.** [*Историческое* краеведение Белоруссии: Учеб. пособие / Под ред. Э.М. Загорульского. – Мн., 1980.; Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове XX стагоддзя / М.В. Півавар // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. № 3. – С. 46–52; Півавар, М.В. Развіццё краязнаўства на Беларусі ў другой палове XX ст. / М.В. Півавар // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: актуальные проблемы из исторического прошлого и современности: материалы Международной научно-теоретической конференции, Витебск, 29–31 октября 2003 г. /

Репозиторий ВГУ

Витебск. гос. ун-т. им. П.М. Машерова; редкол.: В.А. Космач [и др.]. – Витебск, 2003. – С. 232–233.]

2. **Рэгіянальныя асаблівасці ў развіцці краязнаўства Беларусі** [Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове ХХ стагоддзя / М.В. Півавар // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. № 3. – С. 46–48;]
3. **Школьнае краязнаўства ў 1960 – 2000-я гг.** [Детский туризм и краеведение в Беларуси / Авт.-сост. С.М. Митрахович. – Мн., 2003.; Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове ХХ стагоддзя / М.В. Півавар // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. № 3. – С. 46–50;]
4. **Краязнаўчая дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў (БДТАПГіК, Беларускі фонд культуры, Беларускае краязнаўчае таварыства, "Паходня" (г. Гродна), "Талака" (г. Мінск).** [*Трэпет*, Л. Краязнаўства / Л. Трэпет // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі.: у 6 т. – Мінск, 1998. – Т. 4. – С. 257–260; *Каханоўскі*, Г.А. Беларускае краязнаўчае таварыства // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя / редкал.: І.П. Шамякін (гл. ред.) [і др.]. – Мінск.: БелЭн., 1993. – С. 81; Півавар, М.В. Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 1961 – 1991 гг.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / М.В. Півавар; Беларус. дзярж. ун-т. – Віцебск: Выдавецтва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2007. – 21 с.]
5. **Дзейнасць гісторыка-культурнага таварыства "Узгор'е" (г. Віцебск)** [Півавар, М.В. Краязнаўчая дзейнасць клуба "Узгор'е" ў Віцебску ў канцы 1980 – пачатку 90-х гадоў / М.В. Півавар // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 2004. – № 4. – С. 10–13.]

***Літаратура***


1. Гужалоўскі А.А. Музеі Беларусі (1941–1991 гг.). – Мн., 2004.
2. Детский туризм и краеведение в Беларуси / Авт.-сост. С.М. Митрахович. – Мн., 2003.
3. Историческое краеведение Белоруссии: Учеб. пособие / Под ред. Э.М. Загорульского. – Мн., 1980.
4. Каханоўскі, Г.А. Беларускае краязнаўчае таварыства / Г.А. Каханоўскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя / редкал.: І.П. Шамякін (гл. ред.) [і др.]. – Мінск.: БелЭн., 1993. – С. 81.
5. Півавар, М.В. Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 1961 – 1991 гг.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / М.В. Півавар; Беларус. дзярж. ун-т. – Віцебск: Выдавецтва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2007. – 21 с.
6. Півавар, М.В. Краязнаўчая дзейнасць клуба "Узгор'е" ў Віцебску ў канцы 1980 – пачатку 90-х гадоў / М.В. Півавар // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 2004. – № 4. – С. 10–13.
7. Півавар, М.В. Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове ХХ стагоддзя / М.В. Півавар // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. № 3. – С. 46–52.
8. Ткачоў, М. Паходня: кн. публіцыстыкі / рэд.-склад. С.П. Самуэль. – Мінск: БелЭн, 1994. – 288 с.
9. Трэпет, Л. Краязнаўства / Л. Трэпет // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі.: у 6 т. – Мінск, 1998. – Т. 4. – С. 257–260.


Семінар 4

***Сучасны стан і перспектывы краязнаўства***

1. **Праца краязнаўцаў-аматараў (на прыкладзе: Улашчыка М., Каханоўскага Г., Падліпскага А., Плавінскага М., Мельнікава М.Ф.)** [артыкулы ў Энцыклапедыі гісторыі Беларусі: "*Каханоўскі* Г.", "*Улашчык* М."; уступнае слова пра Улашчыка з кнігі: Улашчык, М. Выбранае / М. Улашчык. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2001. – 608 с.; Півавар, М.В. Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 1961 – 1991 гг.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / М.В. Півавар; Беларус. дзярж. ун-т. – Віцебск: Выдавецтва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2007. – 21 с.; Півавар, М. Краязнаўца з Віцебска, або Не забывайма пра сваіх руплівцаў // артыкул у Інтэрнэце – па пошукавіку набраць назву артыкула, ці "Плавінскі М", ]

Репозиторий ВГУ

2. **Выданне “Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі”, кніг гісторыка-дакументальнай хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі “Памяць”.** [Аналіз кнігі “Памяць” раёна ці горада месца пражывання]
3. **Мясцовая краязнаўчая перыёдыка** (“Полацкі летапісец”, “Віцебскія сшыткі”, “Браслаўскія чытанні”, “Браслаўскія сшыткі”,”Мішпоха”). “Краязнаўча газета” [аналіз тэматыкі, праблематыкі, складу аўтараў, карэспандэнцыі, мэтаў, часу, існавання]
4. **Краязнаўчыя рэсурсы ў Internet. Пошук краязнаўчай інфармацыі ў сродках масмедыа** [аналіз сайта “Наш край Віцебшчына”, сайта Віцебскай абласной бібліятэкі, сайтаў раённых выканкамаў і іншыя].
5. **Перспектывы і праблемы развіцця краязнаўства на сучасным этапе**. Дылетантызм ў краязнаўстве [Півавар М. Месца краязнаўства ў гістарычнай навуцы і дзяржаўнай ідэалогіі Беларусі, Расіі, Украіны ў другой палове ХХ ст. // Краязнаўчая газета. – 2004. – № 25.]

**<u>Творчае заданне:</u>**

- Правесці параўнальны аналіз развіцця гістарычнага краязнаўства ў БССР і Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд (пісьмова).
- Зрабіць аналіз кнігі “Памяць”, прысвечанай роднаму гораду, раёну (пісьмова) .

**Рэфераты:**

1. Кніга М. Улашчыка “Была такая вёска” – класічны прыклад краязнаўчай працы.
2. Бюлетэнь “Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”, яго роля ў пашырэнні краязнаўчых даследаванняў.
3. “Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі” і яго значэнне ў развіцці гістарычнага краязнаўства Беларусі.
4. Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры: структура, напрамкі дзейнасці, вынікі.
5. Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы ХХ ст.
6. Характарыстыка кніг і артыкулаў краязнаўцаў-аматараў Віцебшчыны (І. Абрамавай, А. Падліпскага, Л. Хмяльніцкай і інш.).
7. Альманах “Полоцкий летописец”
8. Часопіс “Віцебскі сшытак”
9. Краязнаўчыя рэсурсы ў Internet.
10. Браслаўскія музей – арганізатар і каардынатар вывучэння краю
11. Краязнаўчыя выданні Заходняй Віцебшчыны

***Літаратура***


1. Гужалоўскі А.А. Музеі Беларусі (1941–1991 гг.). – Мн., 2004.
2. Детский туризм и краеведение в Беларуси / Авт.-сост. С.М. Митрахович. – Мн., 2003.
3. Півавар, М.В. Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 1961 – 1991 гг.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / М.В. Півавар; Беларус. дзярж. ун-т. – Віцебск: Выдавецтва УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2007. – 21 с.
4. Півавар, М.В. Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове ХХ стагоддзя / М.В. Півавар // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. № 3. – С. 46–52.
5. Трэпет, Л. Краязнаўства / Л. Трэпет // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі.: у 6 т. – Мінск, 1998. – Т. 4. – С. 257–260.
6. Улашчык, М. Выбранае / М. Улашчык. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2001. – 608 с.


## Тэма 3. РОЛЯ АРХІВАЎ, БІБЛІЯТЭК, МУЗЕЯЎ У ВЫВУЧЭННІ КРАЯЗНАЎСТВА

1. Архіўныя установы Рэспублікі Беларусь, асноўныя напрамкі іх дзейнасці

Рэпазіторый ВДУ

2. Дзяржаўныя архівы Віцебскага рэгіёну, характарыстыка іх фондаў
3. Праца даследчыка з архіўнымі дакументамі
4. Абласныя універсальныя навуковыя бібліятэкі – цэнтры краязнаўчай інфармацыі ў рэгіёне. Бібліяграфічныя рэсурсы краязнаўчай інфармацыі ў бібліятэках Віцебска
5. Музейная сетка Рэспублікі Беларусь, спецыфіка краязнаўчай дзейнасці музеяў розных профіляў
6. Гістарычныя і краязнаўчыя музеі
7. Віцебскі абласны краязнаўчы музей і яго філіялы: склад фондаў і экспазіцыі

**Творчае заданне:**

- Выявіць бібліяграфічных рэсурсаў пра сваю малую радзіму (населены пункт, раён).
- Складзіце спіс выданняў, якія неабходна мець у бібліятэцы навучальнай, навуковай, грамадскай, дзяржаўнай установы для аптымізацыі вывучэння роднага краю (на матэрыялах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнай Расійскай бібліятэцы і інш.)
